Ответ прост. Британские юристы не хотят представать идиотами перед собственным народом и потому не пускаются в демагогическо-филологические изыски по поводу содержания термина "банда", прекрасно понимая, что употребление его **в данном контексте** (на страницах газеты) имеет прежде всего эмоционально-оценочный характер, но никак не является утверждением о существовании конкретной вооруженной банды. Ни один британский суд не примет подобного дела. Но у нас г-н Новиков придет со словарем, и, убежденный его филологическими знаниями, а еще больше трепеща перед "авторитетом власти", судья вынесет соответствующий приговор.

Г-н Новиков возмущен "скандально известной публикацией про "Луку Мудищева" и считает нормальным, что по ней "возбуждено уголовное дело". Я уверен, что если бы Джонатан Свифт сегодня жил в Республике Беларусь, то он давно сидел бы в тюрьме. Ибо "Лука Мудищев" — это детский сад по сравнению с памфлетами против английских властей автора "Путешествия Гулливера". В одной камере со Свифтом сидели бы Ювенал, Салтыков-Щедрин. Статья у всех была бы одна — оскорбление достоинства президента.

У нас президент — это не то, что *у них*. У нас президент — это значит самый умный, самый образованный и культурный. Раз народ выбрал — значит, он самый-самый. И поэтому трогать его не моги. Вот скинут с должности — тогда ругай, сколько душе заблагорассудится. А пока — терпи, поскольку не положено.

Совсем другими соображениями руководствуются западные законники по отношению к прессе. Государственный, общественный, политический деятель на Западе — это фигура, самим своим положением обреченная на более чем пристальное, придирчивое, критическое внимание средств массовой информации. Ежели ты министр или президент — терпи и возможную несправедливость, и обидную карикатуру, и желчное высмеивание твоих поступков, особенностей твоего внешнего облика, привычек, манер, вкусов, твоего уровня культуры. На Западе давно сложилось убеждение, что в этом деле лучше пересолить, нежели что-то запрещать. Потому что сегодня запретим критиковать президента, завтра отберем у обывателя его магазинчик... Западный обыватель очень хорошо понимает связь между возможностями острейшей критики власти и его личными интересами. Потому-то в той же Франции не столько критикуют газеты за острые высказывания в адрес властей, сколько упрекают такие известные издания, как "Ле Монд" или "Экспресс", в сервилизме, угодничестве перед правящей бюрократией. Такого же рода упреки звучат и в адрес известных радио- и телеканалов. А такие газеты, как сегодняшние "Народная газета" или "Рэспубліка", там вообще никто бы не выписывал и не покупал. Существование подобной прессы возможно только в условиях тоталитарного государства, в гражданском смысле абсолютно невежественного общества.

Пресса, о которой мечтает белорусский режим

В уже упоминавшейся статье г-н Коноплев размечтался: *"Мне кажется, что в республике очень не хватает издания принципиально нового типа... Опыт зарубежных СМИ в этой области позволяет заключить, что наиболее приемлемым эталоном данного издания может быть так называемая "толстая" газета типа английской "Таймс"*.

А кто, собственно, вам мешает, г-н Коноплев? У вас ведь и деньги и власть... Почему бы вам, в самом деле, на базе, скажем, "Советской Белоруссии" не создать что-то вроде любимой вами "Таймс"?

Уверен, что сам же г-н Коноплев знает ответ на этот вопрос. Солидная, добротная, аналитическая, информационно богатая пресса не может возникнуть в условиях всевластия жадной и тупой номенклатуры. Хорошую газету делают, г-н Коноплев, личности, талантливые журналисты, менеджеры. А ваш режим нацелен на воспитание исполнительных холуев. Поэтому никогда при вас в Беларуси не будет газеты, даже отдаленно напоминающей "Таймс". Ведь вы душите даже те слабые ростки, из которых могла бы вырасти серьезная белорусская пресса. Опыт существования независимых белорусских газет показывает, что в Беларуси есть отличный журналистский потенциал. Но вы не даете развернуться талантливым людям. Мертвой хваткой вцепились вы в газеты и журналы, в радио и телевидение. Контроль и давление — вот суть вашей политики "в этой области".

Почему в других странах Восточной Европы после обретения независимости первым же делом освободили прессу ? Потому что там понимали — никакие прогрессивные процессы не пойдут без этого освобождения. Старые издания акционировались, возникли новые. Государство не влезало в эти процессы. А у нас даже новые крупные издания ("Народная газета", "Рэспубліка") возникали как государственные.

А все потому, что процесс у нас шел иной. Не раскрепощение общества, личности, гражданина, а смена одного авторитарного режима другим. Потому и печать такая. И проект нового закона о печати вполне соответствующий. Не хотелось бы, чтобы он был принят, хотя нет никаких оснований для оптимизма. А иначе — для чего трудились?

Принятие этого закона означает смерть для подлинно независимых газет Беларуси. Останутся, конечно, всякие коммерческие издания, холуйские, бульварные, развлекательные и прочие газетки, которые скопом (восемьсот-девятьсот!) будут символизировать свободу прессы в Беларуси. Выживут сросшиеся с правящей бюрократией пошлые радиостанции. Ну и, конечно, будет жировать прикормленная и поразительно бездарная государственная пресса вкупе с "зимовским" телевидением.

Лукашенко желает, чтобы его рейх был на века. А в рейхе нет места свободной прессе. Но и рейхи, как показывает история, недолговечны.

Зварот

За аднаўленне радыёхвалі. Якую не забываюць...

Абураныя закрыццём канала, слухачы "Радыё 101,2" пачалі збор подпісаў у падтрымку адраджэння любімых перадач. Звыш двухсот чалавек накіравалі ліст на імя прэзідэнтаў А.Р.Лукашэнкі і Б.М.Ельцына як ініцыятараў стварэння Саюза Беларусі і Расіі, гарантаў свабоднага развіцця друку, радыё і тэлебачання. У звароце, у прыватнасці, гаворыцца:

"У варунках падпісання новых саюзных дамоў шмат аб чым гаворыцца. Напрыклад, у артыкуле 13 Статута Саюза Беларусі і Расіі згадваецца, што асноўным абавязкам дзяржаў — удзельніц Саюза з'яўляецца "забеспячэнне свабоды слова і сродкаў масавай інфармацыі..." Але ж гэта, як кажуць, толькі добрыя намеры. Мы ж чакаем ад гэтага Саюза пэўных зрухаў у лепшы бок, бок дэмакратыі і паважання правоў чалавека. Мы, слухачы "Радыё 101,2", дзейнасць якога была без падстаў прыпынена, спадзяемся, што ў хуткім часе зноў пачуем наш любімы канал у ранейшым складзе, які слухала вялікая колькасць людзей".

Вітольд БАРАВІЦКІ.

Нам можна не баяцца сонца

Калі ў чарнаморскіх раёнах цяпер кожны дзень можна пачуць па радыё папярэджанне аб тым, што нельга доўга знаходзіцца на сонцы з-за высокай актыўнасці яго ўльтрафіялетавага выпраменьвання, то жыхарам Беларусі гэтым летам пакуль не пагражае такая небяспека. Як паведамілі карэспандэнту БелТА спецыялісты Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынга азанасферы, усё жывое ў нас па-ранейшаму надзейна ахоўвае ад згубнага ўздзеяння ўльтрафіялетавых промняў даволі магутны азонавы слой.

На працягу першага тыдня жніўня агульнае ўтрыманне азону ў атмасферы над тэрыторыяй рэспублікі стабільна захоўвалася на ўзроўні 305-315 адзінак Добсана. А гэта значэнне нават крыху перавышае сярэднекліматычную норму для нашага рэгіёну.

Таццяна СМІРНОВА, БелТА.

Стоп-кадр

Три премьеры готовит к открытию нового сезона коллектив Белорусского государственного академического драматического театра имени Якуба Коласа в Витебске.

Среди них — "Укрощение строптивой" У.Шекспира. Постановку премьеры на витебской сцене осуществил художественный руководитель Томского театра юного зрителя Юрий Пахомов.

На снимке: *Сцена из спектакля "Укрощение строптивой"*.

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Жанчына-міністр: экзотыка або прадвеснік экспансіі?

Кіраванне як на ўзроўні вядзення хатняй гаспадаркі, так і ў маштабах дзяржавы па традыцыі заўсёды лічылася прэрагатывай мужчыны. І хоць з развіццём цывілізацыі жанчыны паступова пракладваюць сабе шлях да кіруючых пасад, іх колькасць у вышэйшых эшалонах улады па-ранейшаму застаецца засмучальна нізкай. Такі вывад зрабілі эксперты ЮНІСЕФ, якія падрыхтавалі і апублікавалі даклад "Прагрэс нацый, 1997 год".

Паводле даных ААН і ЮНІСЕФ, у цэлым у свеце жанчыны займаюць толькі 7 працэнтаў міністэрскіх пасад, займаючыся ў асноўным рознымі сацыяльнымі пытаннямі, уключаючы адукацыю, здароўе і сям'ю. Агульная доля жанчын-міністраў, якія займаюцца сацыяльнымі пытаннямі, складае ў свеце ў сярэднім 14 працэнтаў, у той час як на палітычных міністэрскіх пасадах жанчын 3 працэнты, а эканамічных — 4 працэнты.

Самымі фемінізаванымі з пункту гледжання прысутнасці жанчын у нацыянальных урадах з'яўляюцца скандынаўскія і паўночнаеўрапейскія краіны. Так, пры сярэднім сусветным паказчыку 7 працэнтаў доля жанчын-міністраў у Швецыі складае 38 працэнтаў, у Фінляндыі — 36, у Даніі і Нарвегіі — па 29. Беларусь у гэтым спісе фігуруе далёка не ў першых радах — жанчыны ў нашай краіне валодаюць толькі 5 працэнтамі міністэрскіх партфеляў. Слабым суцяшэннем для жаночай палавіны Беларусі можа служыць толькі той факт, што па гэтаму паказчыку мы абагналі Італію і Расійскую Федэрацыю, а ў такіх краінах, як Грэцыя, Літва, Малдова, Украіна, Румынія, Чэхія і Эстонія жанчыны-міністры адсутнічаюць наогул.

Вадзім МІЛІЦЫН.

У нашых суседзяў

Амерыканская нафтавая кампанія збіраецца судзіцца з Літвой

Амерыканская нафтавая кампанія "Мобіл" падала ў суд на Літоўскую Рэспубліку за тое, што АТ "Летувас энергія", якая кантралюецца ўрадам, не разлічылася за гаручае, пастаўленае Літве ў 1995-1996 гадах. Паводле падлікаў "Мобіл", доўг Літвы складае 4,5 мільёна долараў ЗША.

АТ "Летувас энергія" адмаўляе гэты доўг і сцвярджае, што прэтэнзіі амерыканцаў незаконныя.

Сітуацыю ўскладняе тая акалічнасць, што ў адным дакуменце міністр гаспадаркі Літвы Вінцас Бабілюс доўг прызнаў. Гэты факт можа стаць важным аргументам на судзе, які павінен адбыцца праз два месяцы. Вядома, калі літоўцы не абдумаюцца і не вырашаць усё ж разлічыцца з прыдзірлівымі амерыканскімі камерсантамі без судовага разбору.

Альгімантас БРАЗАЙЦІС.

"Мастацтва выжывання" па рэцэпту Гурвіча

Тэатр "Вольная сцэна" зноў прадаставіў свой дах для выстаўкі унікальнай па свайму характару і да гэтага часу "бескватэрнай" некамерцыйнай канцэптуальнай галерэі "Брама". Адкрытую тут 7 жніўня новую экспазіцыю складаюць акварэлі мастака Генадзя Гурвіча.

— Аб'яднаныя ў цыклы "Мастацтва выжывання" і "301-е пакаленне" яго работы прадстаўляюць толькі частку творчай палітры, у якой ёсць і жывапіс, і графіка, — сказала карэспандэнту БелТА артдырэктар галерэі мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн. — Пра дзень сённяшні і пра нас у ім (бо 301-е пакаленне — гэта мы з вамі, калі лічыць ад біблейскіх Адама і Евы) расказвае мастак і жартам і сур'ёзна, з любоўю і з прыкрасцю і, безумоўна, з надзеяй.

Кіяўлянін Генадзь Гурвіч, які атрымаў адукацыю ў Ленінградскім вышэйшым мастацкім вучылішчы імя В.Мухінай, свае першыя крокі ў творчасці зрабіў менавіта ў Беларусі. Гэта яго другая персанальная выстава пад патранажам "Брамы", якая фактычна адкрыла іранічную філасофію Гурвіча для паклоннікаў выяўленчага мастацтва.

Лідзія ПЕРАСЫПКІНА.

"Вольная сцэна" пакарыла палякаў

Вялікую цікавасць у польскіх гледачоў выклікаў спектакль "Рычард..." мінскага драматычнага тэатра "Вольная сцэна". Ён быў прадстаўлены 7 жніўня ў Гданьскім оперным тэатры ў рамках Міжнароднага шэкспіраўскага фестывалю.

Як паведаміў карэспандэнту БелТА Генеральны консул Беларусі ў Гданьску Анатоль Бутэвіч, акрамя беларусаў на фестываль прыехалі артысты з Украіны і Вялікабрытаніі, удзельнічаюць у ім і розныя польскія тэатры.

Успрыняццю спектакля ў цудоўным выкананні акцёраў "Вольнай сцэны" не перашкодзіў нават моўны бар'ер. А на шматлікія пытанні, што ж уяўляе сабой "Вольная сцэна" — гэты тэатр быў жыхарам Гданьска ў навіну — яго дырэктар Валерый Мазынскі адказаў, што эксперыментальны характар дзейнасці трупы робіць тэатр непаўторным. Па-першае, "Вольная сцэна" прыцягвае да работы пачынаючых аўтараў, а па-другое, тэатр стараецца ўвасабляць на беларускай сцэне і на беларускай мове значныя творы сусветнай літаратуры.

Аксана ПІВАВАР, БелТА.

Хто крыўдзіць пенсіянераў?

Пісьмо ў рэдакцыю

"Няма слоў, каб выказаць сваё абурэнне з выпадку аплаты камунальных паслуг, якая ўведзена з чэрвеня. Прыпынена дзеянне адзінаццатага артыкула закона аб ветэранах, і ў выніку пенсіянеры — ветэраны вайны і працы, Узброеных Сіл, ахвяры палітычных рэпрэсій павінны аплачваць камунальныя паслугі ў поўным аб'ёме. Але дзе ўзяць грошы? Палова пенсіі ідзе на лекі, другая — на хлеб... За што так крыўдзяць ветэранаў? Як жыць далей? Асабліва адзінокім пенсіянерам".

Таццяна ГАНЧАРОВА,

Мінск.

Каб прасвятліць сітуацыю, я звярнуўся ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Яго чыноўнікі гутараць на гэту тэму даволі неахвотна. З іх слоў стала вядома, што з чэрвеня ўведзены ў дзеянне ўказ прэзідэнта, які і абрэзаў ільготы вышэйназваным катэгорыям ветэранаў. Іх у краіне каля 400 тысяч. Калі раней яны плацілі за кватэру і камунальныя паслугі толькі палову сумы, дык цяпер поўную, бо кампенсаваць датацыю, а гэта болей за 200 мільярдаў рублёў, няма магчымасці.

А як жа абышліся з тым, што згаданы ўказ не стыкуецца з законам аб ветэранах? Папрасілі тлумачэнняў у спецыялістаў Міністэрства юстыцыі. І яны далі даволі арыгінальнае заключэнне. З аднаго боку, падкрэслілі, што яны не надзелены правам тлумачэння заканадаўчых актаў і ўказаў прэзідэнта, а з другога — раяць кіравацца прадпісаннямі ўказа прэзідэнта.

Цяпер нібыта рыхтуецца "раскрутка назад". Спецыялісты ведамстваў рыхтуюць адпаведныя паперы, каб вярнуць пенсіянерам адабраную льготу. Але даць якую-небудзь інфармацыю аб гэтым ніхто не адважваецца. Ды і невядома, якое рашэнне яшчэ будзе прынята.

Не выключана, што зноў адбудзецца гісторыя, якая ў свой час была з цаной на батоны. Памятаеце? Спачатку ўзнялі на іх цану, а пачуўшы абурэнне людзей, хуценька вярнулі старую, падкрэсліваючы пры гэтым клопат аб народзе. Праўда, крыху пазней цэны імкліва паскакалі ўверх. Так было і пры Кебічы, так і пры цяперышнім прэзідэнце. Галоўнае, што адбывалася, — гэта не стабілізацыя цэн, а часовае прыпыненне іх росту і прапагандысцкая шуміха аб клопатах пра народ. Мяркую, менавіта такі варыянт будзе выбраны і з аплатай камунальных паслуг.

Насельніцтва цяпер пакрывае толькі 30—35% расходаў на ўтрыманне камунальнай сферы. Грошай у дзяржавы на іх пакрыццё няма. Так што цэны на паслугі будуць расці. Вось калі і ў якім аб'ёме адбудзецца павышэнне, ніхто не ведае. Ва ўсякім выпадку мне не далі такую інфармацыю. Нават не ўдалося атрымаць лічбу аб тым, колькі ж людзей цяпер не плацяць камунальныя паслугі. Але з дасведчаных крыніц вынікае, што дзесьці амаль кожны чацвёрты ўжо мае запазычанасць. Як з імі быць? Высяляць з кватэр? Дык заканадаўствам такое не прадугледжана. Рабіць выгляд, нібыта нічога не адбываецца? Дык па іх прыкладу хутка перастануць аплачваць камунальныя паслугі і астатнія.

Як мне падалося, гэтыя праблемы моцна хвалююць чыноўнікаў і мы можам чакаць нейкіх непапулярных мер у адносінах не толькі да пенсіянераў, але і астатніх бедных слаёў грамадства.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Беларускія дзеці сталі сваімі ў многіх галандскіх сем'ях

Незвычайную пасадку зрабіў 6 жніўня ў аэрапорце Амстэрдама самалёт Ваенна-паветраных сіл Нідэрландаў, што выконваў спецыяльны рэйс з Беларусі. На яго борце знаходзіліся 120 дзяцей, якія прыбылі ў Галандыю на летні адпачынак. Іх запрасіла ў сваю краіну дабрачынная арганізацыя, якая працуе пад апекай Нідэрландскага Чырвонага Крыжа.

Тыдні знаходжання беларускіх дзяцей у сем'ях жыхароў Галандыі сталі ўжо традыцыйнымі. Шосты раз іх сардэчна прымаюць жыхары гасціннай зямлі. Прама ў аэрапорце дзяцей сустрэлі "галандскія бацькі", з якімі яны ўжо даўно сябруюць і якія бяруць на сябе ўсе клопаты пра іх і адказнасць за іх здароўе на час адпачынку.

Валянціна МЕНШЫКАВА.

Партыйныя разборкі

29 ліпеня на старонках "Народнай волі" быў надрукаваны артыкул Г.Гацкевіча і А.Трусава "Сумленнай сацыял-дэмакраты ў Беларусі быць!" і Заява Камітэта па адраджэнню Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. Рэдакцыя не разлічвала на такі рэзананс — публікацыя выклікала Заяву Сакратарыята ЦК БСДП (НГ)... Друкуючы гэты дакумент у сённяшнім нумары, мы лічым мэтазгодным заўважыць: у далейшым старонкі "Народнай волі" не будуць прадастаўляцца для партыйных разборак.

Брудная справа раскольнікаў не пройдзе

Заява Сакратарыята ЦК БСДП (НГ)

Правакацыя, запалохванне, раскол — вядомыя прыёмы аўтарытарнай улады ў барацьбе супраць апазіцыі. Гэты "джэнтльменскі набор" у поўнай меры выкарыстоўваецца супраць Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народнай грамады), якая была створана год таму ў выніку аб'яднання Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Партыі народнай згоды.

Не здолеўшы перашкодзіць аб'яднанню партый сацыял-дэмакратычнай арыентацыі, пэўныя сілы імкнуцца цяпер раскалоць Народную грамаду.

Цэлы год былы старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады Алег Трусаў, які выступаў супраць адзінства сацыял-дэмакратаў і якога на аб'яднаўчым з'ездзе падтрымала толькі чатыры чалавекі, рассылаў па арганізацыях Народнай грамады лісты з паклёпамі на партыю і яе лідэраў. Але гэта не дапамагала. Партыя заставалася адзінаю, яна ўзмацнялася. Яе прызнаў міжнародны сацыял-дэмакратычны рух. У Народную грамаду пайшла моладзь. Тады раскольнікі скарысталіся амбіцыямі С.Шушкевіча, "дзякуючы" бязвольнай і згодніцкай палітыцы якога быў правалены рэферэндум у 1992 г., зрабіў кар'еру А.Лукашэнка, а краіна, у рэшце рэшт, ператварылася ў запаведнік таталітарызму ў Еўропе.

Карыстаючыся сваёю вядомасцю і сувязямі, С.Шушкевіч на пачатку вясны гэтага года выцягнуў подпісы вядомых дзеячаў культуры пад вонкава нейтральнай "Заявай Камітэта па адраджэнню Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады". Пад прыкрыццём гэтай заявы пачаўся чарговы наступ на адзінства нашай партыі. У рэгіянальныя арганізацыі зноў пайшлі лісты з паклёпамі на кіраўніцтва партыі і абяцаннем бліскучай кар'еры тым, хто адколецца ад Народнай грамады. Апафеозам гэтай бруднай кампаніі з'яўляецца апошняя заява, зробленая ад імя "Камітэта па адраджэнню". У ёй без усялякіх доказаў лідэры партыі абвяшчаюцца азефамі, раманамі маліноўскімі і папамі гапонамі. І гэтая заява таксама рассылаецца па арганізацыях БСДП (НГ).

Паўстаюць пытанні, адказ на якія напрошваецца сам сабою. Каму выгаднае шальмаванне адной з асноўных палітычных партый Беларусі? Хто, умела выкарыстоўваючы асабістыя амбіцыі раскольнікаў, стаіць за іх спінамі?

Мы хацелі б давесці да грамадскасці два факты. На пачатку 1996 года, калі пачаўся разгром нацыянальных выкладчыцкіх кадраў (звальнялі дэканаў Алега Лойку, Пятра Шупляка ў БДУ і іншых), апазіцыянер (?) А.Трусаў нечакана для многіх атрымаў пасаду дэкана ў Беларускім універсітэце культуры, а ўжо ў сярэдзіне таго ж года на з'ездзе БСДГ група Трусава спрабавала правесці на пасаду старшыні партыі замест Мікалая Статкевіча былога старшыню КДБ Уладзіміра Ягорава, хоць усе ведаюць, што "былых" гэбістаў не бывае. Мы мяркуем, што каментарыі тут лішнія.

Рытарычным з'яўляецца і пытанне: навошта ўчыняюцца спробы расколоць БСДП (НГ)?

Як пацвердзіў мінулы год, аб'яднанне партый сацыял-дэмакратычнай арыентацыі цалкам апраўдала сябе. Ужо праз месяц пасля аб'яднання БСДП (НГ) у складзе "сямёркі" вядучых партый выступіла супраць спробы дзяржаўнага перавароту. Напярэдадні гэтак званага рэферэндуму партыя актыўна адстойвала дэмакратыю. Не ўсе яе члены аказаліся на вышыні ідэалаў сацыяльнай дэмакратыі. У такіх выпадках Народная грамада рэагавала рашуча і жорстка. Так, за парушэнне асноўных праграмных прынцыпаў з партыі былі выключаны яе сустаршыня Леанід Сечка, дэпутат Іван Пашкевіч і іншыя. БСДП здолела падняць сваю папулярнасць сярод людзей працы. Пра гэта сведчаць шырокія кантакты з прафсаюзамі і, нарэшце, поспех у першым туры на давыбарах у Вярхоўны Савет 24 лістапада 1996 г. З 25 кандыдатаў, якіх вылучыла партыя, 16 перамаглі. Пры гэтым большасць з іх перамагла ў правінцыі і ва ўсходняй частцы краіны. Пасля рэферэндуму, калі іншыя партыі знаходзіліся ў шоку і прапаноўвалі чакаць вясны, сацыял-дэмакраты першыя 8 снежня вывелі людзей на вуліцы і першыя зведалі цяжар рэпрэсій.

Мужная пазіцыя партыі, прадстаўнікі якой узначалілі пяць з шасці дэманстрацый па праезнай частцы вуліц і праспектаў Мінска, не засталася па-за ўвагаю рэпрэсіўнага апарату дыктатуры. Партыі належыць цэлы шэраг сумных рэкордаў. Першы арыштаваны дэпутат Павел Знавец. Першы шматмільённы штраф Мечаслава Грыба. Першая вытрыманая да рэанімацыі сухая галадоўка — Сяргея Марцэлева і Паўла Карназыцкага. Першыя спробы пазбаўлення імунітэту дэпутатаў гарадскіх Саветаў — Георгія Таразевіча ў Мінску і Віктара Ярашука ў Пінску. Найбольшы агульны тэрмін зняволення старшыняў партый — трыццаць пяць сутак Мікалая Статкевіча.

БСДП (НГ) не ўдалося запалохаць нават фізічным тэрорам. 27 ліпеня сацыял-дэмакраты зноў вывелі людзей на праезную частку праспекта Францыска Скарыны.

Год працы БСДП (НГ) паказаў, што ў Беларусі з'явілася моцная палітычная партыя, якая здолела ўвабраць у сябе вопыт маральнага супраціву таталітарызму дысідэнтаў 60—70-х гг. Анатоля Сідарэвіча і Міхася Чарняўскага; палітычны вопыт Георгія Таразевіча, Мечаслава Грыба, Леаніда Лойкі, Аляксея Караля, Уладзіміра Нісцюка; арганізатарскія здольнасці і маральны аўтарытэт яе рэгіянальных лідэраў Алеся Арэстовіча, Вячаслава Болбата, Ірыны Вештард, Міхася Гіля, Юрыя Лаўрэнава, Анатоля Ляўковіча, Іосіфа Палубяткі, Міхала Патрэбы, Мікалая Усціменкі, Аляксандра Шчарбака, Віктара Ярашука, Алеся Яўсеенкі і многіх іншых. Партыя таксама ўвабрала ў сябе энергію, маладосць і вопыт новых лідэраў: Алеся Сердзюкова, Уладзіміра Зуева, Сяргея Марцэлева, Паўла Карназыцкага, Яўгена Касцюшкі, Мікалая Прыварнікава і іншых.

Па сутнасці, толькі сацыял-дэмакраты здолелі прапанаваць краіне лідэра, які дэманструе дастатковыя валявыя і маральныя якасці і здольнасць да ахвяравання. З шасці дэманстрацый апазіцыі па праезнай частцы вуліц і праспектаў Мінска чатыры ўзначаліў, нягледзячы на арышты, Мікалай Статкевіч.

Наша партыя, сацыял-дэмакратычны рух набылі ўплыў, і гэта непакоіць рэжым. Не здолеўшы зламаць і запалохаць сацыял-дэмакратаў і іх лідэра Мікалая Статкевіча, улады выкарыстоўваюць тыповы метад, які спраўдзіў сябе ў адносінах да камуністаў і цяпер выпрабоўваецца на "Бацькаўшчыне", — раскол.

Мы звяртаемся да тых, хто свядома займаецца бруднай справай: не блытайцеся ў Народнай грамады пад нагамі. Памятайце: прыйдзе час і таемнае зробіцца яўным, а за свае справы давядзецца адказваць.

Мы звяртаемся да тых, хто выпадкова апынуўся ў кампаніі раскольнікаў: апамятайцеся! Што вы робіце? Навошта вы дапамагаеце расколваць дэмакратычны рух?

Мы заяўляем тым, хто з'яўляецца сапраўдным арганізатарам правакацыі: вам не ўдасца ні запалохаць, ні зламаць, ні раскалоць нас. Наша вера ў ідэалы сацыяльнай дэмакратыі і незалежнасці — непахісная.

Дайджест

"Шанхайская пижама" для китайской буржуазии. И не только...

Похоже, что Китай претендует на право стать законодателем мировой моды, пишет "Нью-Йорк таймс". Настоящим "писком" летнего сезона в Китае стала так называемая "шанхайская пижама". С виду она ничем не отличается от обычной. Однако самих китайцев это совсем не смущает. На это, как утверждает автор статьи, есть несколько причин, среди которых как национальные, так и политические. Все дело в том, что китайцы во всем придерживаются одного единственного правила: "На первом месте комфорт, на втором — стиль". Во многом, пишет газета, повинен коммунизм, который, как известно, считал дорогостоящую одежду привилегией буржуазии. Как считает автор статьи, сегодня Китай находится на том же уровне развития, что Гонконг и Тайвань в 60-е годы. Там, как известно, в то время появление в публичном месте в пижаме считалось нормой.

Кристер Петерссон — убийца шведского премьера? Сумел отсудить 50 тысяч долларов за... моральный ущерб

Норвежские водолазы начали поиски пистолета, из которого был убит премьер-министр Швеции Улоф Пальме, сообщает "Ассошиэйтед Пресс". Основанием для начала поисков стало завещание умершего заключенного Ларса Тингстрема, в котором указано, что пистолет был брошен в воду канала, разделяющего крупнейшие острова Стокгольма. Полиция не верит завещанию заключенного, поэтому за дело взялись представители негосударственной организации. Напомню, что Улоф Пальме был застрелен 28 февраля 1986 года. Это преступление осталось нераскрытым. В 1989 году полиция арестовала по этому делу некоего Кристера Петерссона, однако суд оправдал его и предписал выплатить 50 тысяч долларов за моральный ущерб. Между тем в завещании Ларса Тингстрема указано, что премьер-министра застрелил именно Кристер Петерссон.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Хороша страна Болгария

3. Жемчужина Черноморья

Это о Варне. А еще ее называют прекрасной и неповторимой.

Но сначала несколько слов об экскурсионных маршрутах, которые предлагают туристские фирмы Несебра. Популярностью пользуется посещение болгарской деревни. Можно не только ознакомиться с бытом, образом жизни ее обитателей, но и послушать национальные песни, увидеть народные танцы, продегустировать вина Болгарии, причем бесплатно — пей, сколько влезет. Возможно поэтому здесь всегда много посетителей.

Столь же популярен и маршрут в Стамбул. Однодневная поездка обойдется в 65 долларов, двухдневная — в сотню. Согласитесь, разве можно устоять и отказаться от поездки в Турцию за такую "смешную" цену. В неповторимом Стамбуле можно не только много чего увидеть и услышать, но и приобрести недорогие, но модные у нас вещи.

Фирмы предлагают посетить столицу Болгарии Софию, другие интересные места и города, в том числе и жемчужину Черноморья Варну.

Удивительна дорога в этот город. От моря автобус резко направляется в Балканские горы. Крутые виражи, глубокие ущелья, прекрасные пейзажи... Горы невысокие — километр семьсот метров, но красочные. В них — серия озер, которые прозвали "глазами Балкан". Есть горячие лечебные источники. Склоны гор заняты виноградниками. Здесь расположен крупнейший винодельческий район. Гид обязательно прочтет короткую лекцию о пользе для здоровья виноградного вина. Кстати, болгарские вина и коньяки продаются здесь по очень низкой цене. За доллар можно купить большую бутылку хорошего вина, а за два-три — коньяка, чем и пользуются туристы, набивая свои рюкзаки перед возвращением домой экзотическими напитками. К сожалению, наша таможня не позволяет провозить столько, сколько хочется.

В горах можно сделать остановку в одном из уникальных ресторанов. Так, ресторан "Пикник" встречает вас хлебом-солью и чашей вина. Вам предложат отведать национальные блюда, послушать концерт болгарской народной музыки, увидеть оригинальный танец на раскаленных углях. А чтобы посетители не усомнились в правдивости увиденного, предлагают желающим подойти к углям поближе и убедиться, что они настоящие, горячие. Но некоторым людям, разгоряченным напитками, и этот довод кажется неубедительным. Рассказывают, один "новый русский" не поверил, снял кроссовки и пустился в пляс на углях. После чего его срочно отвезли в больницу, где он провел остальную часть отпуска.

Подкрепившись в ресторане, в хорошем настроении наша небольшая группа из минчан и санкт-петербуржцев в количестве семи человек спускается с гор к городу солнца — Абзору. По преданию, здесь любили купаться боги. Узнав об этом, мы решили искупаться. Организаторы экскурсии пошли навстречу. После коротких переговоров руководители прибрежного кемпинга разрешили въехать на их территорию, и мы быстро, кто в чем (ведь не догадались прихватить в дорогу купальные принадлежности), побежали к воде. Это придало особую экзотику путешествию.

Через два часа интересного пути наш микроавтобус подкатывает к Варне, прекрасная панорама которой открывается с гор.

Варна — третий по величине город Болгарии с населением в четыреста тысяч человек. В нем около тридцати музеев, более ста памятников культуры и архитектуры, самый большой на Балканах дельфинарий.

О последнем. Никого не покидает равнодушным "дельфин-шоу". Дельфины хорошо танцуют, особенно зажигательную самбу. Когда один из них азартно идет на хвосте по кругу, выпрашивая плавником аплодисменты, зал взрывается ими. Не смолкают они и тогда, когда дельфины начинают играть в футбол. Они раз за разом выбивают хвостом мяч к зрителям, вызывая восторг последних. Причем посылают его так сильно, что он летит под самый потолок.

В аквариуме можно понаблюдать за всеми обитателями Черного моря.

Посетить Болгарию по приемлемой цене вам поможет фирма "Алакс Канхепол". Ее минские телефоны — 220-59-97, 220-46-38. Она предложит также и другие увлекательные путешествия.

На снимках: *Между морем и жилыми кварталами — широкий и тенистый бульвар протяженностью 5 км; один из больших и уникальных храмов Болгарии; в дельфинарии.*

Андрей РУСАКОВИЧ.

Духоўны скарб

Уладзімір БУТРАМЕЕЎ

V. Усяслаў Чарадзей

Усяслаў Брачыславіч — *полацкі князь з 1044 г., сын князя Брачыслава Ізяславіча. Год нараджэння невядомы. Памёр у 1101 г.*

Усяслаў Полацкі — адзін з самых знакамітых полацкіх князёў. Прыгадаем яго продкаў: прапрадзед Усяслава — вялікі Рагвалод, заснавальнік дынастыі полацкіх князёў, прабабка — славутая Рагнеда, яго прадзед — Ізяслаў Полацкі, той што аднавіў дынастыю Рагвалодавічаў, яго бацька — Брачыслаў Полацкі, родны пляменнік Яраслава Мудрага.

Летапісы апавядаюць, што Усяслаў нарадзіўся ў сарочцы, таму і стаў удалым воінам. Ён заняў полацкі прастол пасля смерці свайго бацькі. Калі памёр Яраслаў Мудры і да ўлады прыйшлі яго сыны, выявілася, што на кіеўскі прастол маюць больш правоў нашчадкі Ізяслава, які быў старэйшым братам памерлага.

Але Усяслаў не думаў пра тое, каб перабрацца ў Кіеў, а хацеў узвысіць і ўмацаваць Полацк, каб надаць яму большую значнасць сярод галоўных гарадоў таго часу. Ён загадаў пабудаваць у Полацку Сафійскую царкву, бо такія ўжо былі ўзведзены ў Кіеве і ў Ноўгарадзе. Полацкі князь набраў дружыну і доўгі час рыхтаваўся да барацьбы з сынамі Яраслава Мудрага.

Гэтую барацьбу ён пачаў з нападу на Пскоў. Не здолеўшы ўзяць яго, Усяслаў нечакана пайшоў на Ноўгарад. Ноўгарад не вытрымаў удару, і войскі полацкага князя захапілі яго. Сучаснікі называлі Усяслава чарадзеем. Яны лічылі, што ён мог абарачацца ў ваўка і з'яўляцца то каля сцен Ноўгарада, то каля Кіева.

"Тройчы здабываў ён перамогу, адчыніў браму Ноўгарада, разбіў славу сыноў Яраслава, скочыў воўкам на Нямігу", — пісаў аўтар у паэме "Слова аб паходзе Ігаравым" пра славутага полацкага князя.

Сыны Яраслава павялі свае дружыны супраць Усяслава. Войскі сустрэліся на рацэ Нямізе. "І была сеча жорсткая, і многія пагінулі", — чытаем мы ў летапісе. А аўтар "Слова аб паходзе Ігаравым" апавядае: "На Нямізе снапы сцелюць з галоў, малоцяць цапамі булатнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела".

Сілы сыноў Яраслава аказаліся мацнейшыя, Усяслаў адышоў да Дняпра. Тады кіеўскія князі запрасілі яго на перагаворы. "Прыйдзі да нас, не зробім табе ніякага зла", — сказалі яны, пакляліся і пацалавалі крыж.

Усяслаў паверыў клятве, пераплыў на лодцы Дняпро і прыйшоў у шацёр да сыноў Яраслава. Кіеўскія князі схапілі яго, адвезлі ў Кіеў і пасадзілі ў цямніцу.

Летапісец піша, што Бог пакараў сыноў Яраслава за гэтую здраду — наслаў на іх страшэнных качэўнікаў-полаўцаў. У бітве з кіеўскай дружынай яны ўшчэнт разбілі сыноў Яраслава, і давялося ім зачыніцца ў Кіеве.

Жыхары Кіева, абражаныя паражэннем сваіх князёў, запатрабавалі даць зброю. Яны хацелі самі прагнаць качэўнікаў, якія рабавалі наваколлі Кіева. Але князі пабаяліся ўзбройваць народ. Тады натоўп гараджан кінуўся да княжацкага палаца. Князі ўцяклі з Кіева. Кіеўляне вызвалілі Усяслава і, па словах летапісца, праславілі яго сярод княжацкага двара — абралі вялікім князем.

Сем месяцаў Усяслаў Чарадзей княжыў у Кіеве. Ён прагнаў полаўцаў, зрабіў некалькі пераможных паходаў. Упершыню пад уладай полацкага князя аказаліся славянскія землі ад Ноўгарада і Полацка да берагоў Чорнага мора і горада Тмутаракань на яго ўзбярэжжы.

Але гэта былі вельмі ненадзейныя і нетрывалыя ўладанні. Усяслаў добра разумеў гэта. І калі старэйшы сын Яраслава, які збег з Кіева, з дапамогаю свайго цесця — польскага караля — рушыў на Кіеў, Усяслаў вярнуўся ў Полацк. Старэйшы сын Яраслава аднавіў сваю ўладу ў Кіеве, асадзіў і ўзяў Полацк. Усяслаў Чарадзей праз нейкі час адбіў сваю сталіцу. Увесь час, пакуль ён княжыў у Полацку, кіеўскія князі не пакідалі намеру перамагчы яго. Але гэта не ўдалося ні сынам Яраслава, ні Уладзіміру Манамаху, які авалодаў кіеўскім прастолам пасля іх. Усяслаў Чарадзей адстаяў і горад, і незалежнасць свайго княства, незалежнасць Полацкай зямлі — так у той час называлі беларускую зямлю.

VI. Князі Полацкай зямлі

Барыс Усяславіч — *полацкі князь, сын Усяслава Брачыславіча. Год нараджэння невядомы. Памёр у 1128 г.*

Глеб Усяславіч — *першы менскі князь. Нарадзіўся ў 1070 г. Памёр у 1119 г.*

Васілька — *полацкі князь. Жыў у XII ст.*

Цяжкія часы чакалі Полацкую зямлю пасля смерці Усяслава Чарадзея. Яго дзеці валодалі кожны сваім горадам і часта ваявалі паміж сабой. Улада князя аслабла. У Полацку сход гараджан — веча — то выганяў князёў з горада, то запрашаў зноў, потым зноў выганяў.

Нашчадкі Усяслава Полацкага ваявалі з нашчадкамі Яраслава Мудрага, кіеўскімі князямі. Але ніхто не праславіўся перамогамі ў гэтых войнах, бо родзіч ішоў на родзіча, славянін забіваў славяніна.

Такія падзеі адбываліся на той час не толькі на беларускай зямлі. Усе краіны сярэднявечча прайшлі праз гэта: і Францыя, і Італія, і Англія. Развальвалася і старажытная Кіеўская дзяржава.

Але, нягледзячы на тое, што час не нарадзіў сапраўдных князёў-герояў, варта расказаць пра некаторых з тых, каму дасталася спадчына Усяслава Чарадзея, бо і яны пакінулі след у нашай гісторыі.

Старэйшага сына Усяслава Полацкага звалі Барысам. Гэта імя, якое ён атрымаў пры хрышчэнні. А бацька назваў яго Рагвалодам, у гонар славутага прапрадзеда. Барысу-Рагвалоду і дастаўся полацкі прастол пасля смерці Усяслава Чарадзея. Князь Барыс Усяславіч быў жанаты з дачкою вялікага кіеўскага князя. Ён зрабіў некалькі паходаў на суседнія плямёны яцвягаў і земгалаў. Апошні паход скончыўся вельмі няўдала, і гараджане, сабраўшыся на вечы, прагналі Барыса і пасадзілі на трон аднаго з яго братоў.

Але не гэтым праславіўся Барыс. Вярнуўшыся са свайго пераможнага паходу супраць яцвягаў, князь Барыс Усяславіч Полацкі заснаваў на рэчцы Бярэзіне горад і назваў яго сваім імем — Барысаў. Горад гэты прастаяў не адну сотню гадоў, стаіць і цяпер; сваёй назвай шануе памяць аб полацкім князю.

Заставалася памяць пра Барыса і дзякуючы Барысавым камяням. Гэтыя вялізныя валуны ляжалі ў рэчышчы Заходняй Дзвіны, а таксама каля вёскі Каменка недалёка ад Вілейкі і каля вёскі Высокі Гарадзец у Талачынскім раёне. На камянях высечаны шасціканцовыя крыжы і надпіс "Господи, помози рабу своему Борису". Гэты надпіс загадаў выбіць Барыс Усяславіч у XII стагоддзі, 800 гадоў назад, каб увекавечыць сваё імя. Частка камянёў прапала. Да нашага часу захаваліся толькі 4 такія камяні. Яны данеслі да нас праз гады імя полацкага князя. Усе Барысавы камяні сёння з'яўляюцца гістарычнымі помнікамі.

Другі сын Усяслава Чарадзея — князь Глеб — атрымаў ва ўладанне невялікі тады гарадок Менск. Князь Глеб шмат ваяваў. Ад яго ішлі спрэчкі і сваркі паміж сынамі Усяслава Чарадзея. Ён рабіў набегі на сваіх суседзяў, рабаваў іх гарады і вёскі.

Такі тады быў час, так дзейнічалі многія князі. Кіеўскі князь Уладзімір Манамах перамог Глеба і асадзіў Менск. Глебу давялося заключыць з ім мір. Праз некаторы час Глеб Менскі ўзнавіў напады. І тады сын Уладзіміра Манамаха захапіў Менск, а самога Глеба адвезлі ў Кіеў і кінулі ў цямніцу. Так склаўся лёс Глеба Усяславіча Менскага.

Але імя князя Глеба назаўсёды звязана з Менскам. Прайшлі стагоддзі, Менск стаў сталіцай Беларусі, галоўным горадам беларускай зямлі. І мы заўсёды будзем памятаць, што першым князем у Менску быў сын Усяслава Чарадзея Полацкага — князь Глеб Усяславіч Менскі.

Усе гэтыя падзеі адбываліся ў XII стагоддзі. Славянскія землі былі ахоплены войнамі паміж князямі-родзічамі. У Кіеве памёр князь Уладзімір Манамах, апошні магутны ўладар, які стрымліваў спрэчкі і бойкі. Цяжкі лёс чакаў і Полацкае княства. Яго князі — прамыя нашчадкі Рагнеды і Уладзіміра — заўсёды былі сапернікамі кіеўскіх князёў. Але ў часы Усяслава Чарадзея Полацк змог адстаяць сябе. Цяпер жа яго сыны і ўнукі ваявалі між сабой. Кіеўскі князь Мсціслаў, сын Уладзіміра Манамаха, аб'яднаў сваіх родзічаў і напаў на Полацк і іншыя гарады княства. Войскі рухаліся з усіх чатырох бакоў — з захаду, з поўначы, усходу і поўдня.

Князі Полацкага княства пацярпелі паражэнне. Іх землі былі абрабаваны, гарады разбураны, вёскі спалены. Саміх князёў захапілі ў палон. Разам з жонкамі і дзецьмі іх пасадзілі на тры лодкі і завезлі ў Царград — Канстанцінопаль. Гэта была ссылка — яны не мелі права вяртацца на радзіму.

Але адзін князь — яго імя Васілька — збег з гэтага палону і вярнуўся дамоў. Гараджане Полацка сабраліся на веча, выгналі князя, якога ў іх пакінулі захопнікі, і абралі сваім князем Васільку.

Унутраныя войны разрывалі на часткі і старажытную Кіеўскую дзяржаву. Жыхары Ноўгарада выгналі з горада сына князя Мсціслава кіеўскага. Уцякаючы з Ноўгарада, ён нечакана сустрэў па дарозе полацкага князя Васільку з дружынаю. Васілька мог адпомсціць за жорсткасць, з якой яго бацька абышоўся з полацкімі князямі. Але Васілька не стаў карыстацца няшчасцем сына свайго ворага. Ён не крануў яго і даў клятву не памятаць зла.

У той час, калі князі ваявалі між сабою, здаралася нават, што брат прагнуў крыві роднага брата, велікадушша полацкага князя здзівіла многіх гісторыкаў. Дарэчы, Васілька Полацкі быў братам славутай Ефрасінні Полацкай.

Зразумела, падзеі XII стагоддзя цяжкія і сумныя ў гісторыі беларускай зямлі. Але ўсё ж такі яны пакінулі нам імёны трох князёў, якія варта памятаць: імя заснавальніка горада Барысава — полацкага князя Барыса Усяславіча, першага князя Менска Глеба Менскага і Васількі Полацкага.

Без грифа "Секретно"

Измена Родине в форме шпионажа

Капитан 1-го ранга подводник Александр Никитин окончил Высшее морское училище в г.Севастополе и Военно-морскую академию в г.Санкт-Петербурге.

Служил на Северном флоте. Уволен в запас в 1992 году. 6 февраля 1996 года Александр Никитин был арестован сотрудниками УФСБ г.Санкт-Петербурга и до сих пор находится в СИЗО. Ему предъявлено обвинение по ст.64, пункт "а", УК РФ (измена Родине в форме шпионажа). Обвинение выдвинуто и сформулировано ФСБ как "передача секретной и совсекретной информации за денежное вознаграждение" на основании доклада, предоставленного Александром Никитиным норвежской экологической организации "Беллуна".

Катастрофы на АПЛ

По состоянию на 1995 год на дне океана покоятся шесть атомных подводных лодок: две американские ("Трешер" и "Скорпион") и четыре советские **(К-8, К-219, К-278 "Комсомолец", К-27)**. Три АПЛ СССР погибли в результате аварии, и одна была затоплена в Карском море по решению ответственных государственных ведомств.

Описание трех АПЛ Северного флота, потерпевших катастрофу, приводим ниже.

